# Заданні экспедыцыйным атрадам на 2022\2023 навучальны год

| Клас | Змест задання | Адказны | Тэрмін выканання |
|---|---|---|---|
| 3,5 класы | Папаўненне экспанатамі этнаграфічнага кутка | Ганчар Т.М.<br>Палубінская Я.А. | красавік |
| 6 клас | Папаўненне экспанатамі экспазіцыі краязнаўчага музея “З гісторыі школы” | Пацкевіч Н.В. | красавік |
| 7 клас | Папаўненне экспанатамі экспазіцыі “Народная творчасць” | Войтка В.Ф | красавік |
| 8 клас | Папаўненне экспанатамі экспазіцыі “Іх подзвіг бессмяротны” | Земба А.І | красавік |
| 9 клас | Распрацоўка адукацыйных маршрутаў “Дарогамі ведаў малой радзімы” | Крэчка А.І. | красавік |
| 10 клас | Працягваць збор матэрыялу аб паэтах Зэльвеншчыны | Шэйка І.М. | красавік |
| 11 клас | Працягваць збор матэрыялу аб выпускніках школы, якія закончылі школу з залатым і сярэбраным медалём | Грынцэвіч Л.У. | красавік |

Пратакол №1

паседжання савета музея Каралінскай СШ

ад 19.09. 2018

Прысутнічала: 7 чалавек

Павестка дня:

1. Размеркаванне абавязкаў паміж членамі савета музея
2. Зацвярджэнне плана работы краязнаўчага музея на 2018/2019 навучальны год
3. Абмеркаванне і зацвярджэнне заданняў экспедыцыйным атрадам

Слухалі: па-першаму пытанню кіраўніка музея, А.І. Крэчка, якая прапанавала размеркаваць абавязкі паміж членамі савета музея наступным чынам:

Гаўрылік Сяргей – Старшыня Савета
Шэйка Дар’я – сектар пошукавай работы
Маркоўскі Віталій – фондавы сектар
Кіцун Мілана – сектар экспазіцый і выстаў
Маркоўская Кацярына - сектар экскурсій

Выступілі: Шэйка М.А., педагог-арганізатар, якая прапанавала пагадзіцца з прапанаваным размеркаваннем абавязкаў паміж членамі Савета музея

Слухалі: па-другому пытанню, Крэчка А.І., кіраўніка музея, якая пазнаёміла з планам работы краязнаўчага музея на 2018/2019 навучальны год

Выступілі: Шэйка Д., вучаніца 9 класа, адказная за пошукавы сектар, якая прапанавала зацвердзіць план краязнаўчага музея па пранаваным раздзелам

Слухалі: па-трэцяму пытанню, Гаўрыліка Сяргея, старшыню Савета краязнаўчага музея, які прапанаваў наступныя заданні экспедыцыйным атрадам:

1-2 класы – папаўненне экспанатамі экспазіцыі “Народная творчасць”;
3-4 класы – працягваць збор матэрыялу “Лепшыя людзі аграгарадка. Сямейныя каштоўнасці” (сем’і Кіцун, Маркоўскіх, Лабовіч);
5 клас – працягваць збор матэрыялу аб выпускніках школы, якія закончылі школу з залатым і срэбным медалём;
6 клас – працягваць збор матэрыялу па паэтах Зэльвеншчыны;
7 клас – збор матэрыялу “Легенды і паданні роднага краю”;
8 клас – працягваць збор матэрыялу “Аграгарадкі Зэльвенскага раёна”;
9 клас – папаўненне экспанатамі экспазіцыі “Іх подзвіг бессмяротны”;
11 клас – працягваць збор матэрыялу аб выпускніках школы, якія звязалі свой лёс з настаўніцкай прафесіяй і працуюць у Зэльвенскім раёне

Пастанавілі:

1.1 Выбраць Савет краязнаўчага музея ў складзе 7 чалавек і размеркаваць абавязкі
1.2 Зацвердзіць план работы краязнаўчага музея на 2018/2019 навучальны год
1.3 Зацвердзіць заданні экспедыцыйным атрадам і заслухаць аб іх выкананні на паседжанні Савета краязнаўчага музея у маі 2019 года

Сакратар М.А. Шэйка

Інфармацыя класнага кіраўніка 4 класа аб выкананні экспедыцыйнага задання Савета краязнаўчага музея

У 2017/2018 навучальным годзе 4 клас атрымаў заданне па паўненню экспазіцыі "Народная творчасць".

Была праведзена этнаграфічная экспедыцыя па в в. Навасёлкі, Росцевічы.

Вучні сустрэліся са старэйшымі людзьмі, даведаліся аб назвах вёсак, запісалі мясцовыя песні, паданні.

Жыхары вёскі Росцевічы Сыантовіч Міхаіл Міхаілавіч і Ядвіга Антонаўна перадалі ў школьны музей: матавіла, прас, бязмен.

Май 2018 Я.А. Палубінская

Інфармацыя класнага кіраўніка 9 класа аб выкананні экспедыцыйнага задання Савета краязнаўчага музея

Вучні 9 класа атрымалі экспедыцыйнае заданне: сустрэцца з жывымі сведкамі вайны аг. Каралін, запісаць успаміны.

На жаль, засталося вельмі мала сведкаў той далёкай вайны. Мы змаглі сустрэцца толькі з Ган Марыяй Іванаўнай. Яна расказала аб тым, што ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны наша вёска была падзелена на зоны ўплыву партызан і нямецка-фашысцкіх акупантаў. Мяжа праходзіла па мосце праз раку Зальвянку, які быў знішчаны ў гады вайны. У сувязі з такім складаныі становішчам вёска гарэла некалькі разоў. Успамінала Марыя Іванаўна аб тым, як разбамбілі ваенны аэрадром у в.Горна, ніводнаму самалёту не ўдалося ўзняцца ў паветра.

Успаміны Марыі Іванаўны выкарыстаны пры напісанні даследчай працы на навукова-практычную канферэнцыю “Падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Каралінскага с/с”.

Май 2018 А.І. Земба